# ДОБРАГА ВАМ ЗДАРОЎЯ, ІВАН ІЛАРЫЁНАВІЧ!



Спаўняецца 75 год аднаму з выдатных дзеячоў аховы здароўя — дэрматавенеролагу і гісторыку медыцыны, заслужанаму ўрачу Беларускай ССР, дацэнту Віцебскага медыцынскага інстытута Івану Іларыёнавічу Багдановічу.

50 год жыцця аддадзена ўрачэбнай, навуковай, педагагічнай і грамадскай дзейнасці.

Студэнцкая пара Івана Іларыёнавіча прайшла ў сценах Маскоўскага універсітэта ў 1918—1921 гг.

У 1921 годзе Іван Іларыёнавіч заканчвае медыцынскі факультэт Маскоўскага універсітэта і едзе працаваць у маладую Беларускую рэспубліку. З першых жа год работы маладога ўрача захапіла прафілактычная накіраванасць, асабліва лячэнне і прафілактыка скурных хвароб.

Малады спецыяліст не мог мірыцца з высокай захворваемасцю скурнымі і венерычнымі хваробамі, якія засталіся ў спадчыну ад царскай Расіі. У 1923 годзе ён арганізаваў першы ў Беларусі скурна-венерычны дыспансер і быў яго галоўным урачом да 1927 года.

Калі акадэмік А. І. Пракапчук па праву лічыцца родапачальнікам лячэння і прадухілення венерычных хвароб у Беларусі, то І. І. Багдановіч — безумоўна, першы беларускі дэрматолаг у Мінску і Віцебскай вобласці, які сканцэнтраваў навуковыя інтарэсы па арганізацыі кафедры скурных і венерычных хвароб і клінікі Мінскага медыцынскага інстытута, дзе працаваў асістэнтам і дацэнтам да 1934 года.

У 1934 годзе пастановай Савета Міністраў Беларускай ССР адкрываецца Віцебскі медыцынскі інстытут. Івана Іларыёнавіча і многіх іншых медыцынскіх работнікаў Наркамат аховы здароўя накіраваў для работы ў Віцебск. Іван Іларыёнавіч стварыў творчы калектыў вучоных і ўрачоў на кафедры скурных хвароб і вёў вялікую работу па падрыхтоўцы ўрачэбных кадраў.

Часовая акупацыя нямецка-фашысцкімі захопнікамі амаль на 5 год прыпыніла работу Віцебскага медыцынскага інстытута. І Іван Іларыёнавіч у гады Вялікай Айчыннай вайны з навуковымі работнікамі эвакуіраваў аснашчэнне і абсталяванне ў Чэлябінск, дзе працаваў галоўным урачом скурнавенералагічнага дыспансера.

Пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны Іван Іларыёнавіч вяртаецца ў Мінск і зноў узначальвае скурна-венералагічны дыспансер і навуковадаследчы інстытут.

У Віцебскім медыцынскім інстытуце ён працуе на працягу 34 год. З іх 11 — на пасадзе дырэктара інстытута.

На ўсіх этапах сваёй шматграннай дзейнасці Іван Іларыёнавіч займаўся праблемамі, якія патрабуюць неадкладнага вырашэння. Тэматыка яго навуковых работ заўсёды актуальная і мае сацыяльнае значэнне. Так, у першыя гады Савецкай улады патрэбны былі арганізацыйныя меры барацьбы са скурнымі і венерычнымі хваробамі. 14 прац былі прысвечаны напярэджанню і лячэнню прафесіянальных хвароб.

Працуючы ў Віцебскім медыцынскім інстытуце, І. І. Багдановіч арганізуе работу па падрыхтоўцы кадраў. Нашым медыцынскім інстытутам падрыхтавана 4800 урачоў і 390 правізараў, якія паспяхова працуюць у медыцынскіх установах нашай краіны. Значны ўклад Івана Іларыёнавіча і ў справу павышэння кваліфікацыі ўрачоў вобласці. Усё гэта дазволіла спалучаць сінтэз лячэбнай і прафілактычнай медыцыны ў барацьбе з хваробамі, што ў канчатковым выніку абумовіла зніжэнне агульнай смяротнасці.

Пад рэдакцыяй Івана Іларыёнавіча выдадзена 9 зборнікаў з агульнай колькасцю 900 навуковых прац, якія маюць не толькі тэарэтычнае, але і вялікае практычнае значэнне.

Для Івана Іларыёнавіча характэрна велізарная працаздольнасць. Ён ніколі не адмаўляўся ад новых задач, якія ставіць перад ім жыццё. У яго выключна развіта пачуццё абавязку перад партыяй і народам, што выхавалі яго, далі магчымасць стаць буйным вучоным.

Іван Іларыёнавіч па-ранейшаму ідзе ў нагу з жыццём, захапляючы асабістым прыкладам вучняў, паслядоўнікаў і сяброў.

Урад нашай краіны высока ацаніў выдатныя заслугі Івана Іларыёнавіча Багдановіча, узнагародзіўшы яго ордэнам Леніна, ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, чатырма медалямі, значком «Выдатнік савецкай аховы здароўя» і прысвоіўшы яму высокае званне заслужанага ўрача рэспублікі.

Жадаем Івану Іларыёнавічу добрага здароўя і далейшых творчых поспехаў, доўгіх год жыцця.

**М. ДЗЯНІСАВА,**
**загадчык кафедры мединстытута.**